In the article considers the mythopoietic interpretation of spatial concepts in Belarusian legends and traditions. Attention is drawn to the differences in the characterization of these images in prose and song genres.

***Аўсейчык У. Я.***

# СТАРАВЕРСКАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА ПАЎДНЁВА-ЎСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIX СТ.: РАССЯЛЕННЕ І КОЛЬКАСНЫ СКЛАД

*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай*

*(Пастуліў у рэдакцыю 12.09.2022)*

Паўднёва-ўсходні рэгіён Беларусі з’яўляецца адным з важнейшых гістарычных цэнтраў старавёрства ва Усходняй Еўропе. Рускія стараверы пасяляюцца на гэтай тэрыторыі яшчэ ў сярэдзіне XVII ст. Аднак крыніцы 2-й паловы XVII – XVIII ст. не даюць поўнай карціны геаграфіі рассялення стараверскага насельніцтва ў рэгіёне. Толькі асобныя даныя таго часу ўказваюць на месцы пражывання старавераў на гэтых землях. Адсутнічаюць таксама і комплексныя статыстычныя даныя аб іх колькасці ў згаданы перыяд. У 2-й палове XVIII – пачатку XIX ст. ужо з’яўляецца значны блок крыніц, якія даюць уяўленне аб колькасці старавераў і месцах іх пражывання ў рэгіёне. Комплекснае статыстычна-дэмаграфічнае вывучэнне старавёрства на названай тэрыторыі пачынаецца толькі ў 1830-х гадах.

Мэта артыкула – выявіць асаблівасці рассялення і прасачыць дынаміку колькасці стараверскага насельніцтва ў паўднёва-ўсходняй Беларусі на аснове даных сярэдзіны XIX ст. У адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам таго часу геаграфічныя межы даследавання будуць абмежаваныя цэнтральнай і паўднёвай часткамі Магілёўскай губерні, а таксама паўднёва-ўсходнімі паветамі Мінскай губерні. Крыніцазнаўчай базай даследавання з’яўляецца комплекс статыстычных і дэмаграфічных даных (апублікаваных і архіўных).

Першыя сістэмныя даныя аб колькасці стараверскага насельніцтва ў беларускіх губернях адносяцца яшчэ да сярэдзіны 1820-х гадоў. Пачынаючы з 1826 г. Міністэрства ўнутраных спраў збірала і сістэматызавала звесткі аб колькасці стараверскага насельніцтва па губернях Расіі. Пры гэтым да дакладнасці лічбаў трэба ставіцца з асцярожнасцю. Пытанні аб пэўнасці афіцыйнага падліку старавераў пастаянна ўзнікаюць не толькі ў даследчыкаў стараверства, але і ў супрацоўнікаў дзяржаўных органаў, якія збіралі і сістэматызавалі гэтыя даныя [2,с. 179 – 180]. У табліцы 1 прадстаўлены звесткі аб колькасці стараверскага насельніцтва ў Магілёўскай і Мінскай губернях ў 1826 – 1846 гг. Прыведзеныя ў табліцы лічбы яскрава сведчаць аб значнай колькасцістараверскага насельніцтваў паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі ў гэты перыяд.

Табліца 1.

| Год | Колькасць старавераў у губернях (чал.) | |
|---|---|---|
| | Магілёўская | Мінская |
| 1826 | 6 843 | 3 777 |
| 1827 | 8 044 | 4 670 |
| 1837 | 8 589 | 7 590 |
| 1839 | 8 714 | 7 122 |
| 1841 | 14 200 | 7 706 |
| 1846 | 14 668 | 4 151 |

Складзена аўтарам на аснове: [2, с. 163, 173, 374, 376, 378, 447]

Выключна статыстычнымі данымі па губернях немагчыма ўявіць поўную карціну рассялення старавераў у рэгіёне (арэалы размяшчаюцца дысперсна, выходзяць за межы губерняў і г. д.). Для вырашэння дадзенай задачы былі прааналізаваны звесткі аб колькасці і месцах пасялення старавераў у асобных паветах і населеных пунктах рэгіёна. У выніку складзена карта-схема рассялення рускіх старавераў у паўднёва-ўсходняй Беларусі (малюнак 1). Як вынікае з аналізу крыніц, у гэты перыяд асноўная колькасць стараверскага насельніцтва рэгіёна пражывала на тэрыторыі Гомельскага, Рагачоўскага, Бабруйскага і Чэрыкаўскага паветаў.




Малюнак 1. Арэалы рассялення старавераў у паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі ў сярэдзіне XIX ст.

У сярэдзіне XIX ст. больш за палову стараверскага насельніцтва рэгіёна пражывала на тэрыторыі Гомельскага павета. Да 1852 г. павет меў назву Беліцкага,а павятовым цэнтрам з’яўляўся горад Беліца (зараз уваходзіць у межы г. Гомеля). У 1852 г. павет быў перайменаваны ў Гомельскі, а павятовым цэнтрам стаў Гомель. Як сведчаць крыніцы, у 1842 г. на тэрыторыі Беліцкага павета (разам з г. Беліцай) налічваўся 10 991 старавер, у 1844 г. – 11 824. Усе яны належалі да папоўскага сагласа [4, арк. 40; 5, арк. 66 адв. – 67]. У 1859 г. у павеце было зафіксавана 12 971 прыхільнікаў старых абрадаў. А ўжо ў 1861 г. іх колькасць, згодна з афіцыйнымі данымі, павялічылася больш чым на 2 тыс. і склала 14 999 чалавек [11, с.15; 12, с.72 – 73]. Як сведчаць статыстычныя даныя, у 1860-х – 1-й палове 1870-х гадоў колькасць старавераў у Гомельскім павеце істотна паменшылася. У 1875 г. іх фіксавалася толькі 11 426 чалавек [7, с. 80].

У сярэдзіне XIX ст. Гомельскі павет быў лідарам сярод беларускіх паветаў і па колькасці стараверскіх культавых пабудоў. Яны з’яўляліся важнейшымі цэнтрамі староверства на гэтай тэрыторыі. Так, у пачатку 1840-х

гадоў у павеце дзейнічала 6 манастыроў. З іх 4 былі мужчынскімі (Макар'еў, Лаўрэнцьеў, Пахом'еў і Нікольскі) і 2 жаночымі (у Ветцы і Спасавай слабадзе). Аднак ужо ў 1844 г. па распараджэнні мясцовага кіраўніцтва Лаўрэнцьеў манастыр быў закрыты, а Макар'еў далучаны да аднаверства. Таксама ў павеце налічвалася вялікая колькасць малітоўных дамоў (у справаздачных дакументах таго часу яны пазначаліся як «часовни и молитвенные дома» з прастоламі або без іх). Так, у павеце існавала 22 храмы, з іх без прастола – 14 (па адным у г. Беліцы, слабодах Жгунская Буда, Новая Мільча, Тарасаўка, Папсуеўка; 2 – у Раманавай слабадзе, 3 – у Леонцьевай слабадзе, 2 – у слабадзе Дубовы Лог, 2 – у Мар'інай слабадзе) і 8 з прастолам (па адным у Спасавай слабадзе і Нікольскім манастыры; 2 – у Косіцкай слабадзе, 2 – у слабадзе Новы Крупец, 2 – у Пахом'евым манастыры). Аднак ужо ў 1844 г. у павеце 9 малітоўных дамоў было «запячатана» (па адным у г. Беліцы, Спасавай слабадзе, слабодах Новая Мільча, Косіцкая, Раманавая, Мар'іна, Пахом'евым манастыры; у слабадзе Новы Крупец – 2) [5, арк. 69 адв. – 71]. Як сведчаць крыніцы, колькасць храмаў стараveраў у Беліцкім павеце заставалася даволі значнай і да канца 1850-х гадоў мала змянілася. Але ў гэты перыяд пад уздзеяннем мерапрыемстваў улад і праваслаўнай царквы іх колькасць некалькі зменшылася. Так, згодна з данымі на 1859 г., у слабадзе Новы Крупец 2 храмы з'яўляліся аднаверскімі. У Леонцьевай слабадзе налічвалася толькі 2 «часовни без престола», а ў слабадзе Дубовы Лог застаўся толькі адзін храм без прастола. У той жа час у слабадзе Новая Мільча згаданы 2 «часовни без престола» (у 1840-х гг. тут была толькі адна) [6, арк. 35 – 35 адв.].

Па колькасці стараveраў у рэгіёне вылучаўся таксама Бабруйскі павет Мінскай губерні. Так, у 1839 г. тут налічвалася 1 920 прыхільнікаў старых абрадаў. У гэты час яны пражывалі больш чым у дваццаці населеных пунктах павета. У тым жа годзе ў павеце былі зафіксаваны стараверскія капліцы («часовни») у Капусцінай слабадзе і сяле Туркі, а таксама адзін малітоўны дом у слабадзе Салоціне [3, арк. 13, 44 – 44 адв., 56]. У наступныя

дзесяцігоддзі колькасць старавераў у павеце некалькі падрасла. Так, у 1858 г. у ім фіксавалася 2 285 старавераў, а ў 1871 г. – 3 232 чалавекі [8, с. 22 – 29; 10, с. 232]. У сярэдзіне XIX ст. амаль усё старaверскае насельніцтва Бабруйскага павета пражывала ва ўсходняй яго частцы, на мяжы з Рагачоўскім паветам Магілёўскай губерні. Пасяленні, дзе фіксаваліся староверы, утваралі дастаткова кампактны арэал (малюнак 1). Сярод населеных пунктаў у гэты перыяд па колькасці старaверскага насельніцтва вылучаліся слабоды Капусціна, Скрыпліца, Туркі, Салоціна.

Значная колькасць старавераў у сярэдзіне XIX ст. пражывала на тэрыторыі Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Афіцыйныя даныя паведамляюць на 1842 г. аб 812 старaверах у павеце. А ў 1844 г. тут налічвалася 765 старавераў, якія пражывалі ў 14 населеных пунктах. У 1840-я гады ў павеце дзейнічала тры старaверскія храмы («часовни») у слабадзе Турск, вёсках Покаць і Галоднае. Як сведчаць крыніцы, на дадзенай тэрыторыі пражывалі як беспапоўцы, так і папоўцы. У 1844 г. у павеце налічвалася 465 старавераў-папоўцаў, а беспапоўцаў – 300 [4, арк. 35 адв., 40; 5, арк. 5 адв., 6 – 6 адв., 15, 27 адв. – 28]. Але ўжо ў 1850-х гадах іх колькасць была амаль аднолькавай. Беспапоўскія пасяленні ў асноўным размяшчаліся ў заходняй частцы павета на мяжы з Бабруйскім і ўваходзілі ў арэал, асноўная частка якога належала да Бабруйскага павета. У яго паўднёвай частцы знаходзілася большасць пасяленняў старавераў-папоўцаў. Колькасць старавераў у Рагачоўскім павеце да канца 1850-х гадоў мала змянілася. У 1859 г. тут налічвалася 708 старавераў [11, с. 19]. У гэты перыяд у павеце фіксавалася тры храмы («часовни без престола») у слабодах Турск, Новая Іванаўка, Покаць [6, арк. 40 адв.]. У наступныя дзесяцігоддзі колькасць старавераў у павеце некалькі вырасла. У 1875 г. іх налічвалася ўжо 1 058 чалавек [7, с. 80].

Частка старaверскага насельніцтва пражывала на тэрыторыі Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Так, у 1842 г. тут налічвалася 228 прыхільнікаў старых абрадаў. А ўжо праз два гады, у 1844 г., іх

колькасць некалькі паменшылася. Афіцыйныя даныя паведамлялі аб 177 стараверах (усе папоўцы), якія пражывалі толькі ў двух населеных пунктах (в. Гронава і Галачоўка). Згодна з данымі, у гэты перыяд у Гронаве знаходзіўся стараверскі храм («часовня»), які яшчэ ў 1840 г. быў запячатаны. Старавeры ж вёскі Галачоўка, як паведамлялася ў афіцыйных дакументах, належалі да прыходаў Беліцкага павета [4, арк. 40 адв.; 5, арк. 43 адв. – 44]. У канцы 1850-х – пачатку 1860-х гадоў колькасць старавераў у павеце некалькі паменшылася. Так, у 1859 г. іх налічвалася 109 чалавек, у 1861 г. – 140 [11, с. 21; 12, с. 72 – 73]. У гэты перыяд дзеючых стараверскіх храмаў у павеце не фіксавалася. Паведамлялася толькі, што ў Гронаве ёсць «часовня», аднак яна ўжо абвалілася і «не заслуживает внимания» [6, арк. 44].

У цэнтральнай частцы Магілёўскай губерні і паўднёвай частцы Мінскай губерні старавераў у дадзены перыяд пражывала даволі мала, а на поўнач ад Рагачоўскага павета амаль не налічвалася. У Быхаўскім, Чавускім, Горацкім, Мсціслаўскім і Клімавіцкім паветах старавeры ў сярэдзіне XIX ст. не згадваліся. І толькі ў канцы XIX ст. зусім нязначная іх колькасць фіксуецца на названай тэрыторыі. Малая колькасць стараверскага насельніцтва налічвалася ў гэты час у паўднёвых паветах Мінскай губерні. У Рэчыцкім павеце да канца 1870-х гадоў амаль усе старавeры пражывалі ў павятовым цэнтры, але іх колькасць тут таксама была невялікай. Не налічвалася старавераў і на тэрыторыі Мазырскага павета. У Ігуменскім павеце, які знаходзіўся на поўнач ад Бабруйскага, стараверскае насельніцтва не фіксавалася да 1870-х гадоў [1, с. 185; 5, арк. 8 – 63 адв.].

У Магілёўскім павеце ў сярэдзіне XIX ст. старавераў налічвалася вельмі мала. Так, у 1844 г. на гэтай тэрыторыі, разам з губернскім цэнтрам Магілёвам, зафіксаваны толькі 81 старавер [5, арк. 66 адв. – 67]. Як вынікае з крыніц, у сярэдзіне XIX ст. амаль усе яны кампактна пражывалі ў паўночна-заходняй частцы павета. Такім чынам, гэтыя месцы кампактнага рассялення старавераў прымыкалі да паўночна-ўсходняй зоны рассялення старавераў у Беларусі. Пры гэтым, як адзначалася ў паведамленнях мясцовай улады, храма

ў іх у гэты перыяд не было і ўсе «требы» яны адпраўлялі ў мястэчку Халопенічы Барысаўскага павета, дзе пражываў іх «духаўнік» [5, арк. 61 адв. – 62]. У канцы XIX ст., як сведчаць статыстычныя даныя, колькасць стараверау расце і ў іншых частках павета, а таксама ў губернскім горадзе Магілёве [1, с. 185].

Пераважная большасць старавераў паўднёва-ўсходняй Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. пражывала ў сельскай мясцовасці. Гарадскіх цэнтраў, дзе былі стараверы ў гэты перыяд, існавала мала. Так, большая частка старавераскага гарадскога насельніцтва рэгіёна фіксавалася ў Гомелі. У 1859 г. у горадзе пражывала 3 114 старавераў, а ў 1861 г. тут налічвалася ўжо 5 182 чалавекі [11, с. 14 – 22; 12, с. 73]. Другім па колькасці стараверскага гарадскога насельніцтва ў рэгіёне быў Бабруйск. Так, у 1839 г. у горадзе налічвалася 190 старавераў, у 1858 г. – 347, у 1863 г. – 397. У Рэчыцы колькасць старавераў у дадзены перыяд была невялікай. Так, у 1858 г. налічвалася толькі 56 чалавек [3, арк. 55; 8, с. 22 – 29; 9, с. 10]. У астатніх гарадах рэгіёна старавераў жыло мала. Нават у Магілёве да канца XIX ст. яны не згадваліся. Невялікая колькасць стараверскага насельніцтва фіксавалася таксама ў Рагачове. У астатніх павятовых цэнтрах рэгіёна (Чэрыкаве, Чавусах, Мсціслаўі, Горках, Клімавічах, Быхаве, Мазыры) стараверы ў сярэдзіне XIX ст. не пражывалі.

Такім чынам, у сярэдзіне XIX ст. у паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі налічвалася значная колькасць старавераў. Асноўная іх маса пражывала ў сельскай мясцовасці (толькі ў Гомелі і Бабруйску фіксавалася іх значная колькасць). Крыніцы сярэдзіны XIX ст. пераканаўча сведчаць пра існаванне ў паўднёва-ўсходняй Беларусі зоны кампактнага рассялення старавераў, якая размяшчалася на тэрыторыі Гомельскага (Беліцкага), Бабруйскага і Рагачоўскага паветаў. Па колькасці стараверскага насельніцтва гэтая зона з’яўлялася лідарам на беларускіх землях (у 1860-я гг. тут налічвалася каля 20 тыс. старавераў). У яе межах лакалізаваліся два вялікія арэалы: Гомельска-Веткаўскі і Бабруйскі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Аўсейчык, У. Я. Дэмаграфічныя працэсы ў старавераў паўднёва-ўсходняй Беларусі ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст. / У. Я. Аўсейчык // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2021. – Вып. 30. – С. 183 – 189.
2. Варадинов, Н. В. История Министерства внутренних дел / Н. В. Варадинов. – СПб. : Тип. МВД, 1863. – 8 т., 8-я, доп. книга. История распоряжений по расколу. – [2], VI, IV, 656 с.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 701.
4. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 170.
5. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 258.
6. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 743.
7. Обзор Могилёвской губернии за 1875 г. – Могилёв : [б. и.], 1876. – 172, 67 с.
8. Памятная книжка Минской губернии на 1860 г. – Минск : Тип. губернского правления, 1859. – 155, 112 с.
9. Памятная книжка Минской губернии на 1865 г. – Минск : Губернская тип., 1864. – 234, 57 с.
10. Памятная книжка Минской губернии на 1873 г. – Минск : Губернская тип., 1872. – 293 с.
11. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1861 г. – Могилёв : Тип. губерского правления, 1861. – 18, 34, 106, 115, 144, 52, 8 с.
12. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1863 г. – Могилёв : Тип. губернского правления, 1862. – 236, 106, XI с.


## РЕЗЮМЕ


В статье выявлены особенности расселения и прослежена динамика численности старообрядцев в юго-восточной части Беларуси на основе статистических и демографических данных середины XIX в. Анализ источников показал, что в этот период в регионе существовала зона компактного расселения старообрядцев (размещалась на территории Гомельского, Бобруйского и Рогачёвского уездов). В её границах выделялись два крупных ареала: Гомельско-Ветковский и Бобруйский.

SUMMARY

The article reveals the peculiarities of the Old Believers' settlement and traces the dynamics of the number of the Old Believers in south-eastern Belarus on the basis of statistical and demographic data of the mid XIX century. The analysis of the sources shows that during this period there was a compact Old Believers' settlement zone in the region (situated in the territory of Gomel, Bobruisk and Rogachevo counties). There were two large areas within its boundaries: Gomel-Vetka and Bobruisk.

***Ван Мэнюань***

## О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОЕКТА «ИССЛЕДОВАНИЕ ТРАНСФОРМАЦИИ В ОБЛАСТИ ОБРАЗОВАНИЯ ТРАНСГРАНИЧНЫХ НАЦИЙ НА БЕРЕГАХ РЕКИ ХЭЙЛУНЦЗЯН (АМУР)» 2017 Г.

*Белорусский государственный университет*

*(Поступила в редакцию 25.04.2022)*

Китай – большая страна с трансграничными этническими группами. С 1990-х годов, с углублением политики реформ и открытости в приграничных районах, многие вопросы в сфере политики, экономики и культуры, связанные с трансграничными этническими группами, постепенно привлекли к себе широкое внимание учёных всех слоёв общества. В рамках Национального фонда социальных наук Китая также появляется всё больше тем, посвящённых данной проблематике. Важным исследованием по вопросу китайско-российских трансграничных этнических групп является проект «Исследование трансформации в области образования трансграничных наций на берегах реки Хэйлунцзян (Амур)» (№ 17BMZ072).

Проект утверждён 30 июня 2017 г. и относится к области исследования этнических проблем. Этот проект был создан в контексте инициативы «Один пояс – один путь», предложенной председателем КНР Си Цзиньпином осенью 2013 г. Ранее проблема исследования приграничной этнической группы не имела комплексного подхода. Его организатором является Сун Лижун, доцент института педагогических наук Университета Хэйхэ. Среди